Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2013-04-19

Ведаць сваю гісторыю

«Круглы стол», прысвечаны 20-годдзю з дня выхаду першага нумара «Беларускага гістарычнага часопіса», прайшоў у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Яго арганізатарамі выступілі НББ і выдавецтва «Пачатковая школа», якое з нядаўняга часу займаецца выданнем «БГЧ».

Дзяніс **МАРЦІНОВІЧ**

У пачатку 1990-х гадоў стала зразумела, што нацыянальная гісторыя мусіць быць напісана з пазіцый незалежнай дзяржавы. Але неабходных пляцовак для апрабацыі даследаванняў у айчынных навукоўцаў тады не існавала. Таму ў Беларусі адзін за адным пачалі ўзнікаць гістарычныя часопісы. Але з розных прычын, у тым ліку фінансавых, шэраг з іх (напрыклад, «Беларуская мінуўшчына», «Спадчына») спынілі сваё існаванне. Нязменна працягвае выходзіць толькі «Беларускі гістарычны часопіс», заснаваны ў сакавіку 1993 года.

Як падкрэсліў ва ўступным слове галоўны рэдактар выдання Максім Гальпяровіч, за 20 гадоў змяніўся фармат і аб'ём часопіса, яго змест і перыядычнасць, а таксама рэдакцыйны склад. Сёння гэта адзіны ў краіне штомесячны навуковы, навукова-метадычны ілюстраваны часопіс па гістарычных навуках і метадыцы выкладання гісторыі. Ужо выйшла 164 нумары агульным тыражом больш як 400 тысяч экзэмпляраў. У «БГЧ» было надрукавана каля 2 тысяч артыкулаў, аўтарамі якіх з'яўляліся даследчыкі больш як з 20 краін свету, у тым ліку Германіі, ЗША, Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі, Сірыі, Украіны, Францыі і інш.

Галоўны рэдактар звярнуў увагу і на асобныя праблемы «Беларускага гістарычнага часопіса». Гэта зніжэнне колькасці падпісчыкаў і, адпаведна, змяншэнне тыражу, а таксама неабходнасць павышэння якасці публікацый. М. Гальпяровіч адзначыў, што рэдакцыйны партфель напоўнены артыкуламі. Але часам складваецца ўражанне, што асобным даследчыкам больш цікавыя спраздачныя матэрыялы, чым арыгінальныя даследаванні.

З юбілеем «БГЧ» павіншавалі афіцыйныя асобы: намеснік міністра адукацыі Беларусі Віктар Якжык і намеснік міністра інфармацыі краіны Уладзімір Матусевіч. В. Якжык прапанаваў больш актыўна выходзіць у медыяпрастору, гэтую ідэю падтрымаў яго калега. Уладзімір Матусевіч выказаў упэўненасць, што ў «БГЧ» павінен быць паўнавартасны сайт. Ён не мусіць дубліраваць папяровую версію. Але там можна праводзіць пэўныя дыскусіі, каб зацікавіць моладзь. Варта праводзіць таксама «круглыя сталы» з удзелам навукоўцаў і размяшчаць іх у інтэрнэце, упэўнены акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі Аляксандр Каваленя.

На думку Алеся Сушы, намесніка дырэктара НББ па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці, прадстаўнікі гістарычных навук павінны ганарыцца, што маюць такое выданне. Напрыклад, у філасофаў аналагічны часопіс адсутнічае. Паводле інфармацыі А. Сушы, «БГЧ» карыстаецца вялікім попытам у чытачоў Нацыянальнай бібліятэкі. Разам з тым, у НББ можна пазнаёміцца з выданнямі Оксфарда і Кембрыджа. А вось айчынныя належным чынам пакуль не прадстаўлены за мяжой. Магчыма, ужо надышоў час выходзіць на сусветную арэну?

Дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вячаслаў Даніловіч звярнуў увагу як на станоўчыя, так і на спрэчныя бакі ў цяперашнім становішчы «БГЧ». Да першых былі аднесены ілюстрацыі высокага ўзроўню, чым можа пахваліцца не кожнае навуковае выданне, а таксама даступнасць для чытачоў. Як мяркуе даследчык, у сённяшніх умовах тыраж у тысячу асобнікаў для акадэмічнага часопіса з'яўляецца прыстойным. Адначасова В. Даніловіч адзначыў невялікую колькасць рэцэнзій на навуковыя працы калег і адсутнасць на старонках канструктыўнай крытыкі. Таксама ён прааналізаваў спіс матэрыялаў, надрукаваных у «Беларускім гістарычным часопісе» за мінулы год. Больш як палову з іх складаюць метадычныя публікацыі. Таму існуе небяспека пераўтварэння выдання ў выключна метадычны часопіс.

Прыведзеныя разважанні былі паглыбленыя ў далейшай дыскусіі, у якой узялі ўдзел акадэмік НАН Беларусі Міхаіл Касцюк, першы рэдактар «БГЧ» Васіль Кушнер, старшыня рэдакцыйнай рады выдання Юрый Бохан, дырэктар НББ Раман Матульскі, прафесары Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Віктар Фядосік і Алег Яноўскі, загадчыкі аддзелаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі Аляксандр Груша і Аляксей Літвін, прафесар Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны Рыгор Лазько, даследчыкі з Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка Аляксандр Рацько і Аляксандр Корзюк, а таксама колішні супрацоўнік «БГЧ» Сымон Барыс.

Здольнасць крытычна ацэньваць уласную працу, бачыць у ёй не толькі перамогі, але і пралікі заўжды з'яўлялася передумовай будучых поспехаў. Дзелавы, добразычлівы, але адначасова крытычна-канструктыўны тон дыскусіі надзвычай парадаваў. Гэта сведчанне таго, што «Беларускі гістарычны часопіс» мае патэнцыял для далейшага развіцця.

Дзяніс Марціновіч. Ведаць сваю гісторыю